

Дзвінскі ўзгорак

Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець у будучую сінь

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №2 (89)
СТУДЗЕНЬ 2019 ГОДА

ЗМАГАННЕ

СНЕГ НА УЛИЦАХ ВИТЕБСКА

Помощник прокурора Витебска Людмила Познякова и главный инженер предприятия «Гордормост» Александр Сысоев проверили, как убирают от снега объездные дороги, на которых появилось большое количество транспорта в связи с закрытием Полоцкого путепровода.

Начался рейд с улицы Покровской. Сосульки здесь практически на каждом доме, они висят блестящими каскадами, переливаясь на солнце, и на каждом шагу того и гляди обрушатся на голову прохожим.

АлександрСысоевпоясняет,чтоуборка сосулек — задача собственников зданий (ЖЭУ, товарищества собственников, организаций). Кое-где возле домов территория огорожена, но больше ничего не делается, люди должны переходить на другую сторону улицы. Тротуары не расчищены, протоптана лишь узкая тропинка, и разминуться здесь сложно. До самого дома-музея Марка Шагала по тротуару не пройти.

Сама улица убрана плохо, машина едва не застревает в снежной каше. Главный инженер поясняет, что в задачу «Гордормоста» входит уборка магистральных и сквозных улиц, тротуаров на них. Она проводится круглосуточно, но техники не хватает, чтобы охватить весь город, когда снегопады каждый день. Да и машинный парк не обновлялся с 2010 года.

На улице Революционной положение с тротуарами не лучше. А вот на улице Красина, похоже, не ступала нога работника ни «Гордормоста», ни «Зеленхоза». Дворники, видимо, о существовании такой улицы даже не подозревают. Знают о ней лишь жители, которые по колено в снегу вынуждены пробираться к цивилизации.

Александр Сысоев уточняет, что на их предприятии на ручную уборку ежедневно выходят 70–80 человек. Но улица Красина в их перечне участков, подлежащих уборке, не числится. А вот Покровская есть.

Где-то и вовсе протоптаны только тропинки — здесь может пройти лишь один человек. В одном месте на улице Городокской мы встретили сотрудников «Гордормоста», которые начали сооружать тротуар, устанавливают бордюры. Но завершить обустройство тротуара можно будет лишь весной. Главный инженер отмечает, что там, где позволяет ширина тротуара запустить щетку, чистит трактор, где нет — убирают вручную.

Работники «Гордормоста» встретились нам на улице Максима Горького в районе бывшей фабрики «КИМ», улиц Текстильной, Зеленогурской и еще в некоторых местах.

Проходили грейдеры, которые расширили проезжую часть по улице Ленинградской, потом техника пошла на улицу 14-юПолоцкую.

В этот день, по словам Александра Сысоева, работали пять щеток, столько же «пескарей». У многих сотрудников большие переработки, а потому им дали выходной.

По улице 2-й Заслонова людям пройти невозможно, тротуаров здесь нет. Можно ли их сделать, нужно уточнять в ГАИ, поскольку ширина полосы проезжей части должна быть не менее 3,5 метра, а тротуара — не менее 1,2 метра.

Узенькие улочки не расчищены, люди с трудом добираются до своего дома. Представитель «Гордормоста» поясняет: сюда не может зайти техника, поскольку жители будут жаловаться, что снег с улицы убрали в сторону домов. Кто-то молча возьмет в руки лопату, а кто-то станет звонить и жаловаться.

В некоторых местах не расчищены даже остановки транспорта, люди стоят в снегу. Такое положение было, например, на улице Ленинградской. Здесь прочищена только основная магистраль, за которую, впрочем, «Гордормост» не отвечает. Главный инженер отмечает, что улицы частного сектора — в ведении администраций районов, которые закрепляют их за предприятиями.

Сворачиваем на улицу Леонова. Остановки транспорта здесь тоже за¬снежены, но видно, что там, где может пройти трактор, он проходил. Улица Карла Маркса стала значительно уже, тротуар очистили с одной стороны, с другой же его и вовсе нет, и, соответственно, здесь территорию очистит лишь весна.

Самое лучшее положение было в районе ДСК. Территорию возле своего предприятия чистит «Витебскдрев», ездитьпоэтойдорогеодноудовольствие: широкая и ровная, она убрана идеально. Выводит свою технику на улицу и ТЭЦ. Правда, проезд к культурно-деловому центру «Первомайский» был завален снегом.

Во дворах по Московскому проспекту, на улице Чкалова люди могут передвигаться только по проезжей части — ни один тротуар не расчищен.

На улице Максима Горького проезжая часть была убрана чисто, но в то же время с двух сторон вдоль всей трамвайной линии тянулись валки снега.

Помощник прокурора Витебска Людмила Познякова интересуется, почему снег находится практически в центре проезжей части. Следует ответ, что когда филиал «Городской электрический транспорт ОАО «Витебскоблавто¬транс» чистит пути, то не убирает за собой сметенный снег, хотя его работники должны следить за дорогой на расстоянии полуметра от крайней рельсы. Кроме того, техника «Горэлектротранса» выходит на уборку тогда, когда «Гордормост» уже закончил работу, а потому эти валки и остаются неубранными. А договориться две организации никак не могут.

Что же мешает руководству организаций вместе с администрациями районов собраться вместе и обсудить все нюансы уборки города? Ведь для того, чтобы Витебск был удобным для жителей и гостей, нужно всего лишь объединить усилия.

По результатам обследования состояния улиц и дорог прокурор города внес в горисполком представление, в котором потребовал обеспечить взаимодействие всех коммунальных служб, отвечающих за эту работу.

Витьбичи

Чытайце сайт
Віцебскага раёна:
http://vicebskreg.by

АДПАЧЫНАК

НОВАЯ АЗДАРАЎЛЕНЧАЯ БАЗА

На аўкцыёне 22 студзеня прадалі былы аздараўленчы лагер «Рамантыкі» у Віцебскім раёне. Новым уласнікам стала прыватная кампанія з Мінскай вобласці, паведамляе камітэт дзяржмаёмасці аблвыканкама.

Былы аздараўленчы лагер «Рамантыкі", што належаў Віцебскаму камбінату шоўкавых тканінаў, размешчаны на беразе возера ў вёсцы Дрыколле Віцебскагараёна.Ускладлотаўваходзяць шчытавы дом, лазня-душавая, склады, 4 фінскіх домікa з верандамі, сталовая, гароднінасховішча, пірс, артскважына. Агульная плошча будынкаў - 1162 кв. м.

Ацэначны кошт аб'екта панізілі на 20%. На лот прэтэндавалі два пакупнікі, і на пятым кроку аўкцыёну нерухомасць прадалі за 39,3 тысячы рублёў фірме з Міханавічаў Мінскага раёна.

Інвестар мае намер стварыць тут аздараўленчую базу.

А.Адамаў

ПЕРАПРАЦОЎКА

ПЕРВЫЙ МУСОРОСОРТИРОВОЧНЫЙ ЗАВОД

Под Витебском начали строить мусоросортировочный завод. Строительная площадка находится рядом с действующим полигоном твердых бытовых отходов. На предприятии будут не только сортировать, но и частично перерабатывать мусор — в частности, пластик и органику. Подробности — в репортаже телеканала «Витебск».

Мощности предприятия рассчитаны на сортировку и частичную переработку около 100 тысяч тонн отходов в год. За такой период в области для сохранения на полигонах собирается примерно 400 тысяч тонн одного только коммунального мусора (четверть из них «поставляет» Витебск).

Витебск — единственный крупный город в стране, где нет своего мусоросортировочного завода. Новое предприятие планируют сдать в эксплуатацию в 2020 году. Проект обойдется в 39 млн рублей.

А.Смоленский

НЕАДЭКВАТНАСЦЬ

МІЛІЦЫЯ ЗНІШЧЫЛА СЦЯГ

Як паведамляе Радыё Свабода, віцебскі актывіст Андрусь Кешанюк здолеў часткова аспрэчыць судовае пакаранне, накладзенае на яго за святкаванне 100-годдзя БНР: Вярхоўны суд пастанавіў вярнуць яму бела-чырвона-белы сцяг, забраны міліцыянтамі.

Але ў Першамайскім райаддзеле ўнутраных спраў Віцебску ягоную маёмасць знішчылі і нават не прапануюць яе кампенсаваць.

Канфіскаваць бела-чырвона-белы сцяг пастанавіла суддзя Першамайскага райсуду Наталля Караблiна.

Андрусь Кешанюк спрабаваў *(працяг на стар. 2)*

НЕАДЭКВАТНАСЦЬ

(пачатак на стар. 1)

абскардзіць яе рашэнне ў абласным судзе, а потым вышэй, і толькі старшыня Вярхоўнага суду Валянцін Сукала заўважыў судовую памылку. Ён пастанавіў выключыць з пастановаў згадку пра канфіскацыю рэчавых доказаў, бо гэта не прадугледжана артыкуламі пра незаконнае пікетаванне (ч. 2 арт. 23.34 КаАП) і непадпарадкаванне міліцыянтам (23.4 КаАП), паводле якіх актывіста пакаралі.

Аднак на сваё патрабаванне вярнуць незаконна забраную маёмасць Андрусь Кешанюк атрымаў адмову з подпісам начальніка Першамайскага райаддзелу МУС Аляксандра Чарняўскага. Маўляў, вярнуць не можам, бо выканалі пастанову суду ў частцы канфіскацыі маёмасці «на карысць дзяржавы» — знішчылі сцяг разам з бамбукавым тронкам.

Актывіст будзе патрабаваць кампэнсацыі за страчаную маёмасць, а праваабаронца Павал Левінаў упэўнены, што звяртацца трэба не толькі ў органы МУС, але і ў Следчы камітэт, і ў пракуратуру.

«Усё пачалося з некампетэнтнасці суддзі Караблінай. Прычым не толькі ў самой пастанове: чамусьці яна накіравала яе „для выканання“ ў міліцыю, хаця мусіла ў аддзел выканання пакаранняў. У Першамайскім РАУС таксама прадэманстравалі некампетэнтнасць: узяліся яе выконваць. І знішчылі чужую маёмасьць „на карысць дзяржавы“. Гэта не проста адсутнасьць логікі — гэта праява службовай неадпаведнасці як віцебскіх суддзяў, так і міліцэйскага кіраўніцтва», — лічыць праваабаронца.

На яго думку, за такія службовыя прамашкі трэба жорстка караць. Бо «сёння яны знішчаць „на карысць дзяржавы“ сцяг, а заўтра — аўтамабіль» і потым напішуць «вярнуць няма магчымасці».

"Віцебская вясна"

НАДВОР'Е

МЕТЭАРАДЫЁЛАКАТАР

Дарагая ўстаноўка расійскай вытворчасці вышынёй 36,1 метра з'явілася ў раёне Віцебскага аэрапорта і пачала працаваць у штатным рэжыме.

- Аналагічныя ўстаноўкі ёсць у аэрапорце «Мінск», у Гомелі, Брэсце, Гродна, Магілёве, - кажа начальнік аблгідрамета Андрэй Макееў. - І вось доплераўскі мецеалактар з'явіўся ў Віцебскай вобласці, радыус дзеяння яго складае 250 кіламетраў і 15 кіламетраў у вышыню - верхняя мяжы развіцця воблачнасці. Гэта дазволіць «закрыць» усю рэспубліку, каб адсочваць стан хмарных сістэм, па якіх метэаролагі прагназуюць надвор'е з дакладнасцю да трох гадзін. Сучасны радыёлакатар - гэта складанае абсталяванне, якое прадстаўляе сабой, груба кажучы, талерку з антэнай пад купалам, якое працуе на пэўнай частаце. У аўтаматычным рэжыме ў двух плоскасцях сканіюцца ўсе змены, што адбываюцца ў атмасферы, гэта значыць, якая воблачнасць, паветраныя патокі, якой інтэнсіўнасці, іх фазавае стан, ці ёсць град, навальніца, куды рухаюцца аблокі і з якой хуткасцю. Працэс скановання доўжыцца тры хвіліны. Потым ідзе апрацоўка інфармацыі, якая адначасова паступае на некалькі працоўных месцаў, якіх усяго сем ў рэспубліцы: па адным у Нацыянальным аэрапорце «Мінск», Рэспубліканскім гідраметцэнтры і пяць - у Віцебскай вобласці (у аэрапорце і аблгідрамеце). Праз дзесяць хвілін працэс паўтараецца. У выніку можна разлічваць на больш якасны прагноз надвор'я, на больш раннія тэрміны абвесткі аб неспрыяльных і небяспечных метэаз'явах, каб гаспадарнікам, транспартнікам і іншым службам прыняць адпаведныя меры.

На набыццё і ўстаноўку доплераўскага метэаралагічнага радыёлакатара было выдзелена з рэзервовага фонду Прэзідэнта 4 мільёна 400 тысячаў рублёў. Працы па мантажы выкананы ў рэкордна кароткія тэрміны - за дзевяць месяцаў. Генпадрадчыкам выступіла ТАА «Стройторгсервис», пуска-наладачныя работы выконвалі спецыялісты з Масквы і Санкт-Пецярбурга.

Елена БАШУН
http://www.vitbichi.by

БУДАЎНІЦТВА

ЖИЛОЙ ДОМ ДЛЯ МАЗОЛОВО

Трехэтажное здание общей площадью 795,4 квадратных метра на улице Газовиков построили рекордно быстрыми темпами работники Шумилинской ПМК-70.

Таким образом, головное предприятие «Витебскоблгаз» решает одну из важнейших на сегодняшний день задач — обеспечение рабочих кадров жильем и закрепление специалистов в сельской местности.

Перерезать красную ленточку в торжественной обстановке и вручить символический ключ от дома директору СХП «Мазоловогаз» Роману Бабаеву в агрогородок приехали почетные гости — заместитель председателя облисполкома Владимир Белоус, генеральный директор УП «Витебскоблгаз», член Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Петр Шершень, строители и проектировщики.

— Анализируя итоги минувшего года, можно сделать вывод, что в жилищном строительстве области произошел значительный сдвиг вперед, — отметил Владимир Белоус во время своего выступления. — Если в 2017-м было введено в эксплуатацию 251 тысяча квадратных метров жилья, то в 2018-м — свыше 300 тысяч. Более трех тысяч семей улучшили свои жилищные условия.

Владимир Николаевич отметил важность того факта, когда предприятие строит жилье для своих работников самостоятельно, ведь именно на это нацеливает Глава государства.

— Чтобы люди ценили рабочие места и максимально ответственно относились к своим обязанностям, трудились с полной самоотдачей, они должны получать достойную заработную плату, иметь комфортное жилье. В УП «Витебскоблгаз» для этого созданы все необходимые условия, — подчеркнул Петр Шершень.

Планируется, что в новый дом с поквартирным отоплением и круглогодичной подачей горячей воды работники агрокомплекса «Мазоловогаз» будут заселены ближе к концу зимы, чтобы весной они смогли приступить к посевной с уже решенной жилищной проблемой, и ничто их не отвлекало от трудовых будней. На 16 января этого года в СХП «Мазоловогаз» нуждались в улучшении жилищных условий 56 человек, ввод в эксплуатацию нового дома позволит полностью решить этот вопрос.

Стоит отметить, что УП «Витебскоблгаз» ведет целенаправленную политику в области обеспечения своих работников жильем. Так, в марте 2018 года был введен в эксплуатацию 12-квартирный жилой дом в агрогородке Крулевщина Докшицкого района, в сентябре — два одноквартирных жилых дома в деревне Калиново Витебского района.

Светлана ЛЮБОЧКА
"Віцьбічы"

РЭЛІГІЯ

КАТЭДРА ЗАСТАЛАСЯ БЕЗ ПРОБАШЧА

За адзін дзень пад зваротам да Упаўнаважанага ў справах рэлігіі і нацыянальнасьцяў Леаніда Гулякі падпісалася каля 300 чалавек.

Віцебскія каталікі выказваюць незадавальненьне і патрабуюць, каб ім вярнулі іх духоўнага айца і пробашча парафіі Езуса Міласэрнага ў Віцебску Паўла Кнурэка. Пазьней тэкст звароту быў апублікаваны на пляцоўцы Petitions.by.

Пробашч каталіцкай парафіі Езуса Міласэрнага ў Віцебску ксёндз Павал Кнурэк, грамадзянін Польшчы, праслужыў у віцебскай катэдры крыху больш за год. У лістападзе 2018 году ён быў вымушаны пакінуць краіну, бо не атрымаў дазвол на далейшае служэньне ў Беларусі. Да прыезду ў Віцебск сьвятар больш за 16 гадоў узначальваў парафію Сьв. Апостала Андрэя ў Лынтупах (Пастаўскі раён).

Як расказваюць парафіяне, перад ад'ездам у Польшчу пробашч суцяшаў вернікаў. Казаў, што растаньне часовае і што цягам некалькіх месяцаў пытаньне можа вырашыцца і ён вернецца да паствы.

Але 13 студзеня пасьля ўрачыстай імшы Біскуп Віцебскі Алег Буткевіч паведаміў парафіі, што ад Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў прыйшла чарговая адмова на працягненьне служэньня ў Беларусі. «Без тлумачэньняў прычын. І цяпер ужо канчаткова», — удакладніў біскуп Алег Буткевіч.

Біскуп прызнаўся, што вельмі расчараваны адмовай і заклікаў вернікаў маліцца ў інтэнцыі ўладаў, каб яны былі больш адкрытымі да каталіцкага Касьцёлу і ягоных патрэбаў.

Парафіяне абвясьцілі збор подпісаў пад зваротам да Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў Леаніда Гулякі з просьбай перагледзець рашэньне аб непрацягненьні дазволу на служэньне ў Беларусі кс. Паўлу Кнурэку і дазволіць яму вярнуцца ў сваю парафію. Просяць таксама патлумачыць, зь якой прычыны было прынятае рашэньне аб забароне на яго служэньне ў нашай краіне.

За адзін дзень пад зваротам падпісалася каля 300 чалавек. Вернікі кажуць, што ў выпадку чарговай адмовы, будуць зьвяртацца ў Адміністрацыю прэзыдэнта.

«Рашэньне не працягнуць дазвол на служэньне а. Паўла выклікае тым больш зьдзіўленьне, што ў апошнія гады нашая дзяржава яскрава дэманструе адкрытасьць сьвету. У 2018 годзе Указам Прэзыдэнта быў павялічаны тэрмін бязьвізавага знаходжаньня замежных грамадзян на тэрыторыі нашай краіны да 1 месяца. І зусім незразумела, як пры гэтым чалавек, які больш за 15 гадоў адпрацаваў у Беларусі на ніве духоўнага адраджэньня нашай Айчыны, пазбаўляецца права знаходзіцца і служыць на яе тэрыторыі. Упэўненыя, што такія забароны шкодзяць іміджу ўсёй краіны», — гаворыцца ў звароце да Гулякі.

«І вельмі прыкра, што гэта адбываецца ў юбілейны для парафіі год, бо сёлета мы адзначаем 20-годдзе кансэкрацыі касьцёла Езуса Міласэрнага», — пішуць віцебскія каталікі.

Запэўніваюць, што зусім не ўспрымалі а. Паўла Кнурэка як чужаземца, бо «адпраўляў набажэнствы, прамаўляў казаньні і размаўляў зь людзьмі на добрай беларускай мове», выдатна ведаў нашую культура і ўсімі сродкамі спрыяў яе развіцьцю.

«Мы перакананыя, што для людзей, якія сеюць дабро, любоў і сапраўдную веру, Беларусь павінна заўсёды трымаць дзьверы адчыненымі. З таго, што яны раптам зачыняюцца перад кімсьці, вынікае, на наш погляд, толькі шкода ды напружанасьць у грамадзтве», — гаворыцца ў звароце да Гулякі.

Нагадаем, падчас перадкалядная прэс-канфэрэнцыі Біскуп Віцебскі Алег Буткевіч зьвяртаў увагу на «пэўныя складанасьці з запрашэньнем сьвятароў з замежжа, ня толькі з Польшчы». Казаў, што вакансіі сьвятароў у Віцебскай дыяцэзіі пакуль немагчыма кампэнсаваць ксяндзамі-беларусамі. Паводле Біскупа, на падрыхтоўчых курсах у духоўнай сэмінарыі навучаюцца зараз усяго два чалавекі з дыяцэзіі.

Паводле нашай інфармацыі, за апошнія тры гады (2016–2018) улады ня далі аніводнага дазволу на служэньне ў Віцебскай дыяцэзіі замежнікам — каталіцкім сьвятарам альбо манашкам.

Зьміцер Міраш
«Віцебская Вясна»

АБ'ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Дзвінскі Ўзгорак" паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэдэфануйце.

Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звярайцеся на адрас газеты "Дзвінскі Ўзгорак".

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.



Дзвінскі ўзгорак

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

ВЕЧНЫ НОВЫ ГОД

Пераход ад «ліхіх дзевяностых» да стабільнасці «нулявых» суправаджаўся мэтанакіраваным забойствам палітыкі, што і прывяло да спынення эканамічнага росту.



Неяк так атрымалася, што я перастаў успрымаць Новы год у якасці свята. Для «жаўрука» дасядзець без справы да апоўначы — дадатковая праблема. Не назіраць жа за эстраднымі скокамі ў тэлевізары. Я тэлевізар шмат гадоў не гляджу, акрамя футбольных матчаў з удзелам «Манчэстар Юнайтэд», дый за імі ўсё часцей сачу праз інтэрнэт.

…Важна падкрэсліць, што гаворка ідзе пра разуменне — і не больш за тое, бо любыя публічныя заявы, кім бы ў краіне яны ні рабіліся, на рэальнае жыццё прыкметна не ўплываюць.

Новы год — свята, пазбаўленае ідэалагічнай нагрузкі. Таму навагоднія звароты адзінага палітыка (АП) пачынаюцца з развагі пра самыя лепшыя пачуцці і чаканні, што аб'ядноўваюць родных, сваякоў і сяброў, якія сабраліся за святочнымі сталамі.

Аднак зусім без таго, што па-сапраўднаму набалела, не абыходзіцца. У гэтым годзе да ліку набалелага можна было прадказальна аднесці дзве тэмы: па-першае, развагі пра суверэнітэт і незалежнасць дзяржавы, па-другое, пра мір, які ў чарговы раз удалося захаваць.

Мае чаканні спраўдзіліся. Цытую: «Мы гублялі родных і блізкіх, набывалі новых сяброў, нараджалі і гадавалі дзяцей. Але галоўнае — мы захавалі мірнае неба для беларусаў і ў вачах нашых дзяцей няма страху і безвыходнасці ад вайны».

«Але асаблівую цеплыню сваіх слоў я накіроўваю вам, працаўнікам палёў і заводаў, нашай інтэлігенцыі, абаронцам Айчыны, старэйшаму пакаленню і старым. Усім, хто стварыў на дабрадатнай беларускай зямлі першую суверэнную і незалежную дзяржаву, працягвае тварыць яе сучаснасць. Мы павінны ўмацаваць сваю дзяржаўнасць на прынцыпах сумленнасці і справядлівасці і менавіта такой захаваць краіну для дзяцей і ўнукаў».

Донар стабільнасці

Займеннік «мы» ў першай цытаце згадваецца двойчы. Але гэта не тоесныя «мы». Звярніце ўвагу на другі сказ: «мы захавалі мірнае неба для беларусаў ...». Гэта значыць, не самі беларусы дамагліся такога выбітнага выніку, а «мы» для беларусаў.

Што ж, калі беларусы ў гэтай справе ўдзелу не прымалі, і мірнае неба — вынік дзейнасці абмежаванай групы асоб, зашыфраванай пад займеннікам першай асобы множнага ліку «мы», дык такое дасягненне тым больш можа прэтэндаваць на званне галоўнага дасягнення года. Вось толькі пра чыіх дзяцей ідзе гаворка? Колькі я ні перачытваў цытату, зразумець так і не змог. Але чые б яны ні былі, я за дзяцей шчыра рады.

Беларусь, калі хто забыўся, прызнаецца краінамі Еўропы ў якасці донара стабільнасці і бяспекі. Прынамсі, міністр замежных спраў Уладзімір Макей у гэтым упэўнены. Донару стабільнасці важна не апынуцца ў ролі шаўца без ботаў. Але, калі меркаваць па адсутнасці страху і безвыходнасці ад вайны ў вачах нашых дзяцей, і ў мінулым годзе Беларусі ўдалося выканаць свае донарскія абавязальніцтвы ў поўным аб'ёме.

Магчыма, з апошняй высновай я паспяшаўся, і дзякаваць за гэта варта не Беларусі і беларусам, а ўсё той жа групе асоб, якія хаваюцца пад займеннікам «мы». Але ці так ужо гэта істотна?

Пяройдзем да аналізу другой цытаты. У поўнай адпаведнасці з савецкім бэкграўндам АП, спіс тых, «хто стварыў на дабрадатнай беларускай зямлі першую суверэнную і незалежную дзяржаву», адкрываюць працаўнікі палёў. Далей ідуць працаўнікі заводаў і наша інтэлігенцыя.

Класічная савецкая трыяда: два класы (рабочыя і сяляне) і паміж імі інтэлігенцыя ў выглядзе праслойкі. На клас яна не цягнула. «Таму, — згодна са справядлівай заўвагай Леніна, — у ёй усё бессістэмна: на кілаграм прыстойных людзей даводзіцца дэкалітр усялякай брыдоты». Ці захаваліся такія суадносіны да нашых дзён — я казаць не бяруся, але ўвесь мой жыццёвы вопыт падказвае, што на істотны зрух на карысць павелічэння колькасці прыстойных людзей разлічваць не даводзіцца.

Любоў да працаўнікоў палёў перадалася АП з малаком маці. І не бяда, што ўклад сельскай гаспадаркі ў ВУП складае сёння каля 7%. Не ў працэнтах справа. Справа ў менталітэце, які быў і застаецца пераважна сялянскім.

Бліжэй да канца спісу размясціліся абаронцы Айчыны. Прычыну, паводле якой яны згаданыя, мяркую, не трэба тлумачыць. А што да старэйшага пакалення і старых — куды ж без іх напярэдадні чарговай электаральнай «вакханаліі»? Гэта яны, як неаднаразова адзначалі незалежныя сацыёлагі, стварылі і працягваюць стварагь дзяржаўнасць, якая абапіраецца не на правы, а на сумленнасць і прыстойнасць. Такую вось архаічную дзяржаўнасць!..

…Архаіка на маршы

1990-я гады мінулага стагоддзя, безумоўна, былі «ліхімі», але без гэтай ліхасці не ўпала б «жалезная заслона», не быў бы прыняты Закон аб кааперацыі, які адкрыў шлях для прыватнай ініцыятывы ў эканоміцы. Калі б не 1990-я гады, беларусы і сёння душыліся б у чэргах не па «гумавую» каўбасу, а па хлеб і гнілую бульбу.

Нямецкі эканаміст Вернер Зомбарт увёў у навуку, а аўстрыйскі эканаміст Ёзэф Шумпетэр папулярызаваў паняцце «стваральнае разбурэнне». Працэс стваральнага разбурэння з'яўляецца ключавым для капіталізму. Гэта дзякуючы яму беспярапынна ствараюцца новыя тавары, новыя метады вытворчасці, новыя рынкі і новыя формы індустрыяльнай арганізацыі. І галоўным суб'ектам зменаў выступае, натуральна, прадпрымальнік.

Але для паўнавартаснай праявы сваёй суб'ектнасці прадпрымальніку мае патрэбу ў канкурэнтным асяроддзі. І не толькі ў эканамічнай сферы, але і ў палітычнай. Прычым у другой нават больш, чым у першай, бо падтрыманне канкурэнцыі ў эканоміцы магчымае толькі за кошт канкурэнцыі ў палітыцы.

У Беларусі пераход ад «ліхіх дзевяностых» да стабільнасці «нулявых» суправаджаўся мэтанакіраваным забойствам палітыкі. Палітыка памерла, а разам з ёй спыніўся эканамічны рост, што і пацвярджаецца марнасцю намаганняў урада адшукаць новыя драйверы эканомікі.

Сёння мы назіраем архаіку на маршы, і ўзначальвае гэты марш дзяржава, што мудрагеліста спалучае ў сабе феадальныя і сучасныя элементы. І ўсё ж колькі б сучаснасці ў гэтую дзяржаўную бочку ні дадавалася, і адной лыжкі феадалізму ў выглядзе непадкантрольнай улады хапае для яе нейтралізацыі.

* * *

Феадалізм пакінуў нам у спадчыну формулу «васал майго васала — не мой васал». У Беларусі з яе ўладнай «вертыкаллю» яна не прыжылася, што і зафіксавана ў Канстытуцыі ўзору 1996 года. Аднак, нягледзячы на такі архаічны факт, я дазволю сабе скончыць гэту «Азбуку паліталогіі» фінальным сказам са звароту АП: «З Новым годам, дарагія сябры!»

Сяргей Нікалюк
"Новы час"

ВЕНЕСУЭЛЬСКИЙ ОБЛОМ

КАК РУХНУЛИ НАДЕЖДЫ НА ЭЛЬДОРАДО

При обвале нефтяной экономики ни Мадуро, ни любой на его месте не в силах расплатиться с Беларусью, авансом вбухавшей в Венесуэлу сумасшедшие деньги...

Минск и Москва снова разошлись в подходах. Владимир Путин лично поддержал Николаса Мадуро, которого венесуэльская оппозиция объявила узурпатором, а вот белорусский МИД лишь невнятно высказался в том духе, что венесуэльский народ сам может справиться с трудностями.

Трудности — это очень мягко сказано. Там завал, экономический коллапс, катастрофа, при подавлении протестов уже убито 26 человек.

Минск не влезает в тамошний конфликт потому, говорят аналитики, что надеется найти общий язык с новыми властями, если Мадуро падет. Сейчас в Венесуэле фактически двоевластие, лидер оппозиции Хуан Гуайдо объявил себя исполняющим обязанности президента и получил поддержку ряда стран, прежде всего США.

Плакали наши денежки

Белорусские власти в свое время капитально вложились в Венесуэлу. Каракас задолжал нам сотни миллионов долларов. Говорят о полумиллиарде, но это не точно, большие начальники темнят.

Что, между прочим, лишний раз ставит вопрос о прозрачности политики, подотчетности правящей верхушки обществу. Будь у нас нормальная демократия и разделение властей, парламент, например, мог бы потребовать у правительства справку, в какую копеечку влетела «братская интеграция» с Венесуэлой. Но у нас на такую смелость депутатов рассчитывать трудно.

В любом случае Москва вложила в Венесуэлу намного больше (по данным российского оппозиционера Алексея Навального, 17 млрд долларов). Но для нее сейчас главное не отбить деньги, а принципиально ответить Вашингтону, с которым идет большая геополитическая заруба. Звонок Путина Мадуро означает: только попробуйте суньтесь, чертовы янки, наводить свои порядки в Венесуэле!

Белорусское же руководство, напротив, активно наводит мосты с Вашингтоном. Недавно глава МИДа Владимир Макей несколько раз звонил в госдеп (и это слили в прессу), сообщил, что снят лимит на число американских дипломатов в Минске, готовится возвращение послов.

Это, кроме всего прочего, сигнал белорусских властей восточной соседке, с которой сейчас новые крутые терки: на вас, дорогие российские партнеры, свет клином не сошелся.

Но положа руку на сердце — прорыва в отношениях с Вашингтоном не будет. А вот с Каракасом в любом случае облом, и надолго. При рухнувшей моноэкономике (нефть дает 95% экспортной выручки) ни Мадуро, ни любой на его месте не в силах расплатиться с Беларусью, руководство которой и на этом направлении село в галошу…

...Халява всегда кончается

Эти маниловские прожекты рухнули вместе с мировыми ценами на нефть. Режим Мадуро, преемника умершего от рака Чавеса, враз оказался финансово-экономическим и политическим банкротом.

Если вдуматься, то подобным образом сдулось и белорусское экономическое чудо, которое тоже было завязано на нефть. Точнее, на большую маржу от переработки этого сырья, получаемого из России без пошлин. Как только мировые цены на нефть упали, а Москва ужесточила условия субсидирования, наша экономика капитально забуксовала.

Спасает то, что у нас все-таки не моноэкономика. Хотя модель тоже однобокая, кривая. И очевидно, что годы нефтяного офшора белорусские власти потратили бездарно: упустили время для экономической перестройки, ухода от модели «сборочного цеха СССР», провалили модернизацию, опоздали с развитием наукоемких отраслей, ИТ-сектора и пр. Сохраняется колоссальная зависимость от российских энергоресурсов.

Иначе говоря, Беларусь страдает из-за постоянной надежды ее начальства на ту или иную халяву. Но халява — будь то венесуэльская, будь то российская — рано или поздно заканчивается.

Венесуэльские уроки

Кроме всего прочего, венесуэльский проект Минска показал, что найти альтернативу российской нефти будет непросто. Попытки возить это сырье от Чавеса танкерами провалились — оказалось вдвое дороже. И даже после завершения налогового маневра в России ее нефть, вероятно, будет самой

(працяг на стар. 4)

ВЕНЕСУЭЛЬСКИЙ ОБЛОМ

(пачатак на стар. №3)

выгодной для белорусских НПЗ из-за удобной логистики.

А значит, у Москвы останется рычаг давления, ослабить который можно только за счет перестройки экономики. Какни страшна ломка, нужно соскакивать с нефтяной иглы.

Еще один урок венесуэльской авантюры: надо вовремя тормозить, когда партнер становится явно неплатежеспособным. Белорусские же предприятия, похоже, много поставили и построили авансом. Боялись свернуть сотрудничество (это же курс президента!), даже когда надежды получить плату стали призрачными.

Наблюдая же за теперешней смутой в Венесуэле, Лукашенко, вероятно, укрепляется в мысли, что демократия до добра не доводит. Ведь хоть Мадуро и жесткий правитель, но оппозиция сумела завоевать парламент. Значит, там худо-бедно считались голоса.

Белорусское руководство наверняка не позволит такого разгула гнилой демократии. Предстоящие парламентские и президентские выборы пройдут, скорее всего, по старой схеме, без особо изощренной игры в плюрализм.

Также белорусский президент на примере Мадуро имеет возможность лишний раз убедиться, сколь важно пестовать силовиков и обеспечивать их лояльность. Узурпатор узурпатором, но попробуй сковырни, когда за Мадуро (во всяком случае — пока) и армия, и прочие люди в погонах…

Александр Класковский
“Белапан”

ПАСТКА

РАСЕЯ ХОЧА ПАЗБАВІЦЬ БЕЛАРУСЬ СВАЁЙ ВАЛЮТЫ

Пасьля прэсавай канфэрэнцыі міністра замежных спраў Расеі Сяргея Лаўрова стала трохі больш зразумела, чаго насамрэч хоча Расея ад Беларусі.

…13 сьнежня мінулага году кіраўнік расейскага ўраду Дзьмітры Мядзьведзеў, выступаючы ў Берасьці, заявіў, што «Расея гатовая і далей прасоўвацца па шляху будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, уключаючы стварэньне адзінага эмісійнага цэнтру, адзінай мытнай службы, суду, Падліковай палаты».

То бок меласа на ўвазе стварэньне сумесных органаў улады. Бо адзіны цэнтральны банк, адзіная мытня, суд, служба кантролю за расходаваньнем дзяржаўных фінансаў — гэта агульныя органы ўлады, якія, у пэўным сэнсе, прадугледжваюць адзіную дзяржаву.

А вось са словаў Сяргея Лаўрова вынікае, што «ані агульнай Канстытуцыі, ані агульнага парлямэнту, ні агульнага суду пакуль, напэўна, стварыць не ўяўляецца магчымым, і мы на гэтым зусім не настойваем». То бок палітычныя сыстэмы пакуль кожная краіна захоўвае ў сваім нацыянальным варыянце.

Дык на чым настойвае Масква?

Лаўроў кажа: «Маецца на ўвазе прадугледжаныя ў гэтай дамове дзеяньні дзеля фармаваньня адзінай грашовай адзінкі, адзінай грашова-крэдытнай палітыкі, падатковай палітыкі. Гэтыя рэчы наўпрост зьвязаныя з эканамічнымі і фінансавымі стасункамі ў рамках саюзнай дзяржавы».

Такім чынам, паводле лёгікі Масквы, галоўны элемэнт інтэграцыі — адзіная грашовая адзінка Беларусі і Расеі. У Крамлі нямасумненьняў, што гэта павінен быць расейскі рубель. Пераход Беларусі на расейскія грошы аўтаматычна вядзе да адзінай грашова-крэдытнай палітыкі, падатковай палітыкі, макраэканамічнай палітыкі. То бок, пазбавіўшыся сваіх грошай, Беларусь страчвае магчымасьць праводзіць самастойную эканамічную палітыку.

Пасьля гэтага прымус да стварэньня адзіных органаў улады — справа тэхнікі. Бо без уласных грошай залежнасьць Беларусі ад Масквы будзе прыкладна такая, як у любой расейскай губэрні.

Нават пасада прэзыдэнта можа застацца. Але што гэта будзе за сувэрэнітэт?

Але зусім ня факт, што ў плянах Крамля стаіць задача поўнага аб'яднаньня дзьвюх краін. Цалкам дапускаю, што Беларусь захавае фармальную незалежнасьць. Застанецца свая Канстытуцыя, урад, парлямэнт, сьцяг, герб, гімн, краіна застанецца чальцом ААН, іншых міжнародных арганізацый. Нават пасада прэзыдэнта можа застацца. Але што гэта будзе за сувэрэнітэт? Прыкладна такі, як быў у БССР у складзе СССР. Ці больш сучасны прыклад: статус Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі. Фармальна ж яны незалежныя, хоць фактычна нікім не прызнаныя.

Гэта прыкладна такая самая лёгіка, якой прытрымлівалася Расея на пачатку 2000-х гадоў, адразу пасьля падпісаньня дамовы аб стварэньні «саюзнай дзяржавы» і прыходу да ўлады Пуціна. Тады Лукашэнка настойваў на прыняцьці спачатку Канстытуцыйнага акту «саюзнай дзяржавы», стварэньні наднацыянальных органаў улады (урад, парлямэнт), і толькі потым — пераход на адзіную валюту. А Масква прапаноўвала, наадварот, спачатку аб'яднаць грашовыя сыстэмы — і толькі потым фармаваць адзіныя органы ўлады.

Ці прыме Лукашэнка прапанову Крамля?

Цяжка ўявіць, што Лукашэнка прыме такую прапанову. Хачу нагадаць, што ён упарта працівіцца ўступленьню Беларусі ва Усясьветную гандлёвую арганізацыю, бо сяброўства ў ёй прадугледжвае пэўныя абмежаваньні на правядзеньне эканамічнай палітыкі. А тут яму прапануюць застацца ўвогуле бяз грошай, без уласнай грашова-крэдытнай палітыкі, падатковай палітыкі. У такім выпадку ад ягонай улады нічога не застанецца. Тады ўжо лепш амбасадарам у Зымбабвэ. Менавіта так прагназаваў лёс беларускага кіраўніка мінулым годам галоўны рэдактар «Эха Москвы» Аляксей Венедыктаў.

Валер Карбалевіч

ОРШАНСКИЙ ОФШОР

КТО ОКАЖЕТСЯ В ШОКОЛАДЕ

Одним из основных бенефициаров может стать компания «Бремино групп», за которой стоят приближенные к власти бизнесмены.

«Новый центр роста»

Указ «О развитии Оршанского района Витебской области» Александр Лукашенко подписал в канун Нового года. Проект окрестили Оршанским офшором.

Документ устанавливает особый режим налогообложения для резидентов региона. В нем есть также меры для развития инвестиционной деятельности. Финансирование программы развития района до 2023 года составит 2,4 млрд рублей. В том числе почти один миллиард рублей пойдет из бюджета, кредитные ресурсы предусмотрены в размере 689 млн рублей.

«Новым центром экономического роста» в Оршанском районе в указе называется мультимодальный промышленно-логистический комплекс «Бремино-Орша» и международная торговая площадка при нем. Проект развивает компания «Бремино групп».

Что представляет собой проект «Бремино-Орша»?

В Оршанском районе «Бремино групп» уже запустила автомобильный терминал. Первые грузы прибывают на склад, говорится на сайте компании. В этом году там запланировано строительство железнодорожного терминала. Он предназначен для обработки грузовых потоков между странами Европы и Азии, особенно перспективное направление — транзит китайских контейнеров. Компания уже обрабатывает два-три поезда в месяц на станциях «Орша-Восточная» и «Колядичи».

«Ввод в эксплуатацию железнодорожного терминала позволит принимать с 2019 года один железнодорожный состав (60-80 контейнеров) в сутки. В результате это позволит увеличить к 2023 году транзитные возможности контейнерных перевозок до 5 тысяч составов в год», — говорится в указе.

Комплекс также будет включать авиационный сектор. Там планируется создать цветочную биржу и обрабатывать почтовые интернет-заказы. Запланированы работы по реконструкции аэродрома «Орша».

«С учетом открытия аэродрома „Орша“ для международных полетов прогнозируемые объемы приема грузовых воздушных судов в адрес резидентов, зарегистрированных на территории комплекса „Бремино-Орша“, будут равномерно расти от 100 грузовых воздушных судов в год в 2019 году до 400 судов в 2022 году», — говорится в указе.

Помимо этого «Бремино-Орша» будет включать промышленную зону, офисы, шоу-румы, гостиницу и другие объекты. Предполагается построить 190 тысяч квадратных метров складских и 280 тысяч квадратных метров производственных площадей. Срок завершения всего проекта намечен на декабрь 2023 года. Общие затраты оцениваются в 220 млн долларов.

«Создание мультимодального промышленно-логистического комплекса „Бремино-Орша“ в районе г.п. Болбасово позволит привлечь в республику существенный транзитный грузопоток: 10 млн тонн суммарно за 2018-2022 годы, а при выходе на полную мощность в 2026 году — до 12 млн тонн грузов в год», — говорится в указе.

Кто стоит за «Бремино групп»?

Согласно выписке из регистра Минюста, ООО «Бремино групп» находится в городском поселке Болбасово Оршанского района, а регистрацию получило от Минского райисполкома.

Директором компании с мая прошлого года является Василий Дементей. Раньше он занимал должности заместителей председателя Комитета государственной безопасности и Государственного таможенного комитета. Генеральным партнером проекта указана компания «Белтаможсервис» — государственный оператор на рынке логистических услуг.

Учредителями «Бремино групп» являются успешные и влиятельные бизнесмены Беларуси — Александр Зайцев (30-е место в топ-200), Николай Воробей (17-е место) и Алексей Олексин (6-е место). Каждому принадлежит по одной трети в уставном фонде компании.

Александр Зайцев занимается поставками белорусской техники в арабские и африканские страны через компанию «Сохра групп» и планирует добывать золото в Судане и Гане. Бизнесмена также называют хозяином футбольного клуба «Динамо» (Брест).

Николай Воробей развивает крупнейшее в стране охотничье хозяйство «Красный бор» и «Абсолютбанк». В сферу его интересов также входит торговля нефтепродуктами. Компания бизнесмена «Нефтебитумный завод» была замечена в серых схемах с реэкспортом российских нефтепродуктов.

Среди активов Алексея Олексина — «МТБанк», гостинично-ресторанный комплекс «Сябры», завод по производству мясных продуктов «Велес-Мит». Он также занимается торговлей нефтепродуктами. Недавно ему поручили развивать в стране табачную сеть. Кроме того, бизнесмен планирует построить рядом с Минском табачное производство.

Раньше Олексин работал в компании «Белвнешторгинвест» Управления делами президента и занимался нефтепродуктами. По информации TUT.by, Алексей Олексин помогает развивать байкерское движение в стране. Как известно, мотоциклами увлекается старший сын президента…

Какие бонусы получит «Бремино групп»?

Именно «Бремино групп» станет главным бенефициаром президентского указа о развитии Оршанского района, убежден экономист.

Он не исключает, что компания может получить льготные кредиты под гарантии правительства на развитие комплекса, а также воспользоваться тем широким перечнем льгот, которые прописаны в документе.

Так, в частности, предприятия освобождены от уплаты НДС при ввозе технологического оборудования. Отчисления на пенсионное страхование снижены с 28% до 24%. Общий платеж в ФСЗН с нанимателя уменьшен с 34% до 30%.

Кроме того, снижен размер ежегодной арендной платы за земельные участки. Раньше он определялся исходя из кадастровой стоимости участков с применением коэффициента 0,011, теперь — 0,00251.

Кроме того, в районе вводится мораторий на проведение выборочных проверок, а в отношении внеплановых проверок определен исключительный перечень оснований для их проведения.

Указом также предусмотрена минимизация случаев содержания под стражей обвиняемых и подозреваемых в совершении экономических преступлений....

«Когда государство делает это для отдельной „Бремино групп“, то протоолигархи превращаются в полноценных олигархов. Имея такой статус и работая там, они будут пользоваться очень широкими возможностями и будут главными распорядителями. Получается такой закрытый бизнес. Элитно-номенклатурно-силовой», — подчеркнул Ярослав Романчук…

Александр Ярошевич
naviny.by

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 30.1.2019 у 17.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.